**OSCE/ODIHR**
**Election Observation Mission**
**Republic of Belarus**
**Presidential Election 2010**

# АБСЕ/БДІПЧ пачынае Місію па назіранню за прэзідэнцкімі выбарамі ў Беларусі

Мінск, 15 лістапада 2010 – Бюро АБСЕ па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека сёння начынае назіранне за прэзідэнцкімі выбарамі, што маюць адбыцца 19 снежня ў Беларусі.

Місія, якую ўзначальвае Герт Арэнс, была адкрыта па запрашэнні Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь. Яна складаецца з 14 экспертаў у Мінску і 40 доўгатэрміновых наглядальнікаў, размеркаваных па краіне на месяц перад выбарамі.

Дадаткова, БДІПЧ плануе запрасіць 400 кароткатэрміновых наглядальнікаў з краінаў-удзельніц АБСЕ, якія пачнуць працу за некалькі дзён перад днём выбараў. Яны будуць назіраць за папярэднім галасаваннем, адкрыццём выбарчых участкаў, галасаваннем, падлікам галасоў і падвядзеннем вынікаў.

Місія ацэньвае адпаведнасць выбараў прынцыпам АБСЕ, міжнародным стандартам дэмакратычных выбараў, і заканадаўству краіны. Назіральнікі будуць адсочваць выбарчую кампанію, заканадаўства і практыку яго ўжывання, сітуацыю з СМІ, працу выбарчых камісій і іншых дзяржаўных установаў, вырашэнне спрэчных пытанняў.

Місія БДІПЧ па нагляду за выбарамі аб’яднае свае намаганні з дэлегацыяй Парламенцкай Асамблеі АБСЕ.

Заява з папярэднімі вынікамі будзе зроблена праз дзень пасля заканчэння выбараў. Канчатковая справаздача па назіранню за выбарамі будзе падрыхтавана прыблізна праз восем тыдняў пасля заканчэння місіі па назіранню.

Місія БДІПЧ па нагляду за выбарамі і Офіс АБСЕ ў Мінску працуюць асобна, згодна са сваімі паўнамоцтвамі.

*Каб атрымаць дадатковую інфармацыю звяртайцеся да:*
*Сп. Ягора Тільпунова, медыя-аналітыка, па тэл.:* +375 44 789 8069 *ці электроннай пошце* iegor.tilpunov@eom.by
*альбо*
*да сп. Іэнса Эхенбахера, прэсс-сэкратара БДІПЧ АБСЕ, па тэл.: +48 603 683 122 ці электроннай пошце* jens.eschenbaecher@odihr.pl

Republic of Belarus
15, Storozevskaya, 220002 Minsk
7th floor, Hotel Belarus

Tel.: +375 17 209 7388
Fax.: +375 17 209 7390
email: office@eom.by